Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2022 годзе

## Аналітычны агляд

spring96.org

**Высновы**

- *надзвычай глыбокі грамадска-палітычны крызіс, у вытоках якога — узурпацыя ўлады і яе засяроджванне ў руках А. Лукашэнкі, які дэ-факта не змірыўся з паразай на прэзідэнцкіх выбарах у жніўні 2020 года, адсутнасць у Беларусі эфектыўных дэмакратычных інстытутаў вызначалі працяг і нарошчванне рэпрэсіўнай палітыкі беларускіх уладаў у 2022 годзе;*
- *адсутнасць рэальных прававых механізмаў канстытуцыйнай змены ўлады, абароны і заахвочвання правоў на мірныя сходы, асацыяцыі, свабоду выказвання меркаванняў, свабоды ад катаванняў і іншых відаў жорсткага, бесчалавечнага, зневажальнага абыходжання прывялі да іх татальнай дэвальвацыі ў Беларусі;*
- *дзеянні ўсіх галін улады накіраваныя на пабудову новай — таталітарнай — сістэмы, што выключае любыя адступленні ад дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі, дзеля чаго беспакарана, паводле ўказання і з ухвалення вышэйшых службовых асоб дзяржавы ў грамадстве ўкараняецца атмасфера ўсеагульнага страху, вынішчаюцца любыя праявы іншадумства, падмяняюцца паняцці ў інтарэсах кіруючых колаў;*
- *цаной палітычнай і эканамічнай падтрымкі з боку ўлад Расійскай Федэрацыі дыктатуры, якая страціла легітымнасць і знаходзіцца пад эканамічнымі санкцыямі, сталі забеспячэнне ўладамі Беларусі тэрыторыяй, паветранай прасторай, інфраструктурай Беларусі для расійскай агрэсіі ў дачыненні да суверэннай Украіны, а таксама яе безумоўная палітычная і інфармацыйная падтрымка;*
- *«Вясна» неадкладна і безумоўна асудзіла акт агрэсіі і ўдзел у ім беларускіх улад, падкрэсліваючы, што адной з перадумоў да пачатку вайны стала задушэнне беларускай грамадзянскай супольнасці, якая паслядоўна і непахісна адмаўляла ў падтрымцы імкненню расійскіх і часткі беларускіх уладных эліт ствараць геапалітычныя і вайсковыя саюзы, што ўцягваюць Беларусь у рэалізацыю імперскіх амбіцый уладаў РФ;*
- *вайна ва Украіне аказала неадназначны ўплыў на палітыку дзяржаў і міжнародных арганізацый у дачыненні да Беларусі: яна змяніла вектар усеагульнай увагі, аднак прымусіла задумацца пра шырэйшыя наступствы і большы ўплыў на сусветную палітыку беларускіх унутрыпалітычных працэсаў, чым гэта раней уяўлялася;*
- *пабудова таталітарнай сістэмы запатрабавала змены Канстытуцыі, якая нават у рэдакцыі, што дзейнічала і была створаная дзеля падтрымкі безумоўнага прыярытэту выканаўчай улады на чале з А. Лукашэнкам, перастала задавальняць запатрабаванні дыктатара на сучасным этапе;*
- *адначасова заканадаўчая база губляла рысы прававой і працягвала напаўняцца рэакцыйнымі нормамі, якія ігнаруюць дэмакратычныя канстытуцыйныя асновы і міжнародныя абавязальніцтвы Беларусі;*
- *асноўным інструментамі ўтрымання ўлады і рэпрэсій у дачыненні да апанентаў, крытыкаў рэжыму і іншадумцаў па-ранейшаму з'яўляюцца крымінальны і адміністрацыйны пераслед, адвольныя арышты, звальненне з працы і дэ-факта дэпартацыя;*
- *у Беларусі на 31 снежня 2022 года налічвалася 1 446 палітвязняў, прызнаных такімі праваабарончымі арганізацыямі ў адпаведнасці з Кіраўніцтвам па вызначэнні*

*паняцця «палітычны зняволены»; за год іх колькасць павялічылася на 477 чалавек, прычым больш як 580 чалавек, прызнаных палітвязнямі за апошнія тры гады, былі вызвалены; за год палітвязнямі прызнаны 889 чалавек;*

- *ПЦ «Вясна» вядома пра не менш за 1 242 асуджаных паводле палітычна матываваных крымінальным спраў за 2022 год, пра не менш за 2 627 асуджаных за падзеі 2020–2022 гадоў і амаль пра 3 800 чалавек, якія сутыкнуліся з крымінальным пераследам за гэты перыяд;*
- *ПЦ «Вясна» вядома пра не менш за 6 381 затрыманага і не менш за 3 272 накладзеныя адміністрацыйныя спагнанні за ажыццяўленне сваіх правоў і свабод, з якіх 2 274 — адміністрацыйныя арышты і 938 — адміністрацыйныя штрафы;*
- *улады працягваюць актыўна ўжываць рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў з прычыны іх прафесійнай дзейнасці: згодна са звесткамі БАЖ, 33 журналісты і супрацоўнікі СМІ на цяперашні момант пазбаўлены волі, 43 журналісты былі затрыманы на працягу года;*
- *заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць асацыяцый, будзе істотна пагаршаць іх становішча па шэрагу ключавых момантаў; згодна са звесткамі Lawtrend, з 2021 года ліквідавана і знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі каля 1 180 недзяржаўных арганізацый, што сведчыць пра працяг тэндэнцыі па знішчэнні інстытутаў грамадзянскай супольнасці;*
- *судовая сістэма падчас ажыццяўленні рэпрэсій ігнаруе стандарты справядлівага суда; адвакатура, што страціла асноўныя рысы незалежнага самакіравальнага інстытуту, сама зрабілася інструментам рэпрэсій у дачыненні да адвакатаў; наогул адвакаты ажыццяўляюць сваю дзейнасць ва ўмовах бесперапыннага ціску, пагроз і пераследу, а найбольш актыўныя зведваюць крымінальны і адміністрацыйны пераслед, страчваюць права на працу;*
- *Рэспубліка Беларусь працягвае прымяняць смяротнае пакаранне; на працягу года не паступала звестак пра вынясенне смяротных прысудаў, быў прыведзены ў выкананне раней вынесены смяротны прысуд у дачыненні да Віктара Паўлава; у СІЗА ў чаканні выканання смяротных прысудаў утрымліваюцца два чалавекі; заканадаўча пашыраны і пашыраюцца далей магчымасці ўжывання смяротнага пакарання;*
- *палітычна матываваныя рэпрэсіі 2022 г. працягваюць быць масавымі і сведчаць пра глыбокі крызіс правоў чалавека ў краіне, які прывёў да міжнароднай ізаляцыі Беларусі і санкцый з боку краін ЕС, ЗША і Вялікабрытаніі;*
- *Праваабарончы цэнтр «Вясна» працягвае сваю актыўную працу па абароне і прасоўванні правоў чалавека; 30 верасня арганізацыя атрымала прэмію The Albie Awards 2022, заснаваную фондам «Клуні за справядлівасць», у намінацыі «Справядлівасць для абаронцаў дэмакратыі», 8 снежня ў Гаазе «Вясне» ўручылі праваабарончую прэмію «Цюльпан правоў чалавека 2022», заснаваную ўрадам Нідэрландаў.*

**Уступ**

Летась працягваўся і нарастаў надзвычай глыбокі грамадска-палітычны крызіс, у вытоках якога знаходзілася ўзурпацыя ўлады і яе засяроджванне на працягу чвэрці стагоддзя ў руках А. Лукашэнкі, вынікам якой сталі слабасць дэмакратычных інстытутаў, адсутнасць найважнейшых і абавязковых дэмакратычных гарантый, павагі і выканання правоў чалавека і асноўных свабод. Не змірыўшыся з дэ-факта паразай на прэзідэнцкіх выбарах у жніўні 2020 года, пабачыўшы прыкметы недзеяздольнасці і стомленасці карнага апарату, улада працягвала перафарматаванне сваіх інстытутаў пад патрэбы таталітарнай сістэмы, якая прыйшла на змену аўтарытарызму, канчаткова знішчаючы станоўчыя дасягненні ранейшых гадоў, якія з'явіліся вынікам кампрамісаў і супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, грамадзянскай супольнасцю і яго інстытутамі.

Такім чынам, правы і свабоды, каштоўнасць і ўніверсальнасць якіх і раней не ў поўнай ступені падзяляліся нават у рыторыцы, а дэ-факта рэгулярна парушаліся ўладамі, засталіся без аніякай падтрымкі з боку ўладных інстытутаў. Улады паўсюдна ўкараняюць і агрэсіўна адстойваюць свае правы на парушэнне правіл канстытуцыйнай змены ўлады і ўліку меркавання народа падчас прыняцця рашэнняў, парушэнне права на мірныя сходы, асацыяцыі, умяшанне ў свабоду выказвання меркаванняў. Катаванні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага, зневажальнага абыходжання з палітычных матываў зрабіліся жахліва паўсядзённай, будзённай нормай.

У праводзенне таталітарнай палітыкі ўцягнутыя ўсе галіны ўлады: выканаўчая, судовая і заканадаўчая. Імі выбудоўваецца новая сістэма, якая выключае любыя адступленні ад дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі, закладаецца дзеля гэтага канстытуцыйная і заканадаўчая аснова. З гэтай мэтай ствараецца новая ідэалогія, дзе ў сімбіёзе з наратывамі мінулых гадоў, часоў СССР: варожае асяроддзе, барацьба з дзяржаўнай здрадай, барацьба з нацызмам — ужываецца найноўшая тэрміналогія: барацьба з экстрэмізмам і тэрарызмам, абарона інтарэсаў нацыянальнай бяспекі і да т. п. Ва ўсіх гэтых выпадках сэнс паняццяў цынічна падмяняецца, а вынікам робіцца страх, які татальна пануе ў грамадстве на фоне беспакаранай агрэсіі абаронцаў ладу.

У апублікаваным 9 сакавіка 2022 года дакладзе Упраўлення ААН па правах чалавека адзначаецца, што ціск, які ўрад працягвае аказваць на апанентаў, грамадзянскую супольнасць, журналістаў і адвакатаў, прывёў да парушэння асноўных правоў чалавека дзясяткаў тысяч жыхароў Беларусі і да неспрыяльных наступстваў у жыцці велізарнай колькасці іншых людзей, прытым што няма ніякіх сведчанняў таго, што злачынцаў прыцягнулі да адказнасці. У дакладзе падрабязна выкладзеныя вынікі разгляду УВКПЧ пытання аб палажэнні ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, запытанага Саветам па правах чалавека ААН. Гэты агляд ахоплівае перыяд да выбараў 9 жніўня 2020 года і перыяд пасля іх і да 31 снежня 2021 года.

Цаной палітычнай і эканамічнай падтрымкі з боку ўлад Расійскай Федэрацыі дыктатуры, якая страціла легітымнасць і знаходзіцца пад эканамічнымі санкцыямі, у 2022 годзе стала забеспячэнне тэрыторыяй, паветранай прасторай, інфраструктурай Беларусі для расійскай агрэсіі ў дачыненні да суверэннай Украіны, што паставіла Беларусь у становішча дзяржавы-памагатай агрэсара, якая нясе на чале з дэ-факта кіраўнікамі адказнасць за жахлівыя акты гвалту і разбурэнні. Безумоўная палітычная і інфармацыйная падтрымка акту агрэсіі і

апраўданне дзеянняў агрэсара ў інфармацыйным полі дзяржаўнымі прапагандысцкімі рэсурсамі закліканы нагнятаць у беларускім грамадстве мілітарысцкую гістэрыю на ўзор расійскай і апраўдваць той факт, што адвечная рыторыка А. Лукашэнкі, які абяцаў народу мірнае існаванне наўзамен на лаяльнасць, аказалася фікцыяй.

«Вясна» неадкладна і безумоўна асудзіла акт агрэсіі і ўдзел у ім беларускіх улад, падкрэсліваючы, што дзеянні беларускага рэжыму груба парушаюць як нормы міжнароднага права, двухбаковую дамову паміж Беларуссю і Украінай, гэтак і Канстытуцыю дзяржавы, а таксама канстатавала той факт, што адной з перадумоў да пачатку вайны стала задушэнне беларускай грамадзянскай супольнасці, якая паслядоўна і непахісна адмаўляла ў падтрымцы імкненню расійскіх і часткі беларускіх уладных эліт ствараць геапалітычныя і вайсковыя саюзы, якія ўцягваюць Беларусь у рэалізацыю імперскіх амбіцый улад РФ. Пацверджаннем пазіцыі беларускага грамадства стала серыя антываенных пратэсных выступаў, якія адбыліся напрыканцы лютага і, нягледзячы на прагназаваную беспрэцэндэнтную жорсткасць падчас іх задушэння, сабралі тысячы ўдзельнікаў.

Вайна ва Украіне аказала неадназначны ўплыў на палітыку дзяржаў і міжнародных арганізацый у дачыненні да Беларусі: яна бясспрэчна змяніла вектар усеагульнай увагі, аднак прымусіла задумацца пра шырэйшыя наступствы і большы ўплыў на сусветную палітыку беларускіх унутрыпалітычных працэсаў, чым гэта раней уяўлялася.

У кастрычніку стала вядома пра прысуджэнне Нобелеўскай прэміі міру зняволенаму кіраўніку «Вясны» Алесю Бяляцкаму, Праваабарончай арганізацыі «Мемарыял» і Цэнтру грамадзянскіх свабод: «На працягу шматлікіх гадоў яны адстойвалі права крытыкаваць уладу і абараняць асноўныя правы грамадзян. Яны прыклалі беспрэцэндэнтныя высілкі для дакументавання ваенных злачынстваў, парушэнняў правоў чалавека і злоўжывання ўладай. Разам яны дэманструюць значэнне грамадзянскай супольнасці для свету і дэмакратыі».

У ААН ізноў заклікалі ўлады Беларусі вызваліць Алеся Бяляцкага са зняволення: Анаіс Марэн, Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, Мэры Лоўлар, Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб становішчы праваабаронцаў, і Ірэн Хан, Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб заахвочванні і абароне права на свабоду меркаванняў і іх свабоднае выказванне, апублікавалі сваю заяву пасля рашэння Нобелеўскага камітэта прысудзіць А. Бяляцкаму прэмію міру 2022 года.

Пабудова таталітарнай сістэмы запатрабавала змены Канстытуцыі, якая нават у той рэдакцыі, што дзейнічала і з'яўлялася вынікам замацавання на ўзроўні Асноўнага закона ўзурпацыі аднаасобнай улады Аляксандрам Лукашэнкам, перастала задавальняць патрэбы дыктатара на сучасным этапе. У новай рэдакцыі Канстытуцыі, прынятай на рэферэндуме, які быў праведзены з істотнымі парушэннямі, яшчэ больш размыты адрозненні паміж галінамі ўлады, закладзены бязмежныя магчымасці і гарантыі па ўтрыманні ўлады дэ-факта ў розных дзяржаўных пасадах Аляксандрам Лукашэнкам; саслаблена роля органаў прадстаўнічай улады і судоў.

Адначасова з гэтым заканадаўчая база Беларусі страчвае рысы прававой і працягвае напаўняцца рэакцыйнымі нормамі, якія ігнаруюць дэмакратычныя канстытуцыйныя асновы і міжнародныя абавязальніцтвы Беларусі, прызначаныя дзеля адвольнага пашырэння правоў дзяржаўных інстытутаў і расправы над супернікамі рэжыму: яны прадугледжваюць

адвольнае асуджэнне, пазбаўленне маёмасці, грамадзянства, абмежаванне працэсуальных правоў, узмацненне санкцый за парушэнне прадпісанняў і забаронаў закона, абмяжоўваюць правы асацыяцый і г. д.

«Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі працягвае імкліва пагаршацца, уводзячы краіну ў атмасферу страху і беззаконня», — папярэдзіла, прадстаўляючы свой штогадовы даклад Савету па правах чалавека, Спецыяльная дакладчыца ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Анаіс Марэн і падрабязна апісала палітыку сістэматычнага ўзмацнення жорсткасці заканадаўства, якое абмяжоўвае грамадзянскія і палітычныя правы беларускімі ўладамі. Незалежная экспертка вылучыла канстытуцыйны рэферэндум 27 лютага 2022 года як адзін з апошніх прыкладаў гэтай тэндэнцыі. Згодна з Марэн, працэсу бракавала празрыстасці і адкрытасці, а галасаванне было азмрочана сур'ёзнымі парушэннямі і не можа лічыцца свабодным і справядлівым.

Звыклымі інструментамі рэпрэсій у дачыненні да ўдзельнікаў мірных акцый пратэсту, іншадумцаў, удзельнікаў розных супольнасцяў і ініцыятываў, журналістаў і праваабаронцаў на працягу года былі крымінальны і адміністрацыйны пераслед, адвольныя напады на грамадзян і іх жыллё пад выглядам правядзення следчых дзеянняў паводле надуманых абвінавачванняў, катаванні, жорсткае, бесчалавечнае, зневажальнае абыходжанне з затрыманымі і арыштаванымі.

30 кастрычніка 2022 г. набыў моц закон аб дэнансацыі Рэспублікай Беларусь Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, што пазбаўляе ахвяраў парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, якім было адмоўлена ў правасуддзі на нацыянальным узроўні, магчымасці падаваць свае звароты ў Камітэт па правах чалавека. Прымаючы сваё рашэнне аб дэнансацыі, Беларусь не падала канкрэтных тлумачэнняў і не правяла аніякіх кансультацый з грамадзянскай супольнасцю і няўрадавымі арганізацыямі. Рэспубліка Беларусь робіцца чацвёртай дзяржавай у гісторыі і адзінай дзяржавай у XXI стагоддзі, якая выйшла з Факультатыўнага пратаколу, ратыфікаванага 117 дзяржавамі. Выхад Беларусі з працэдуры разгляду індывідуальных скаргаў з'яўляецца сур'ёзнай перашкодай для абароны правоў чалавека, заявіў Камітэт ААН па правах чалавека.

**Палітычна матываваны крымінальны пераслед. Палітычныя зняволеныя**

У 2022 годзе палітычна матываваны крымінальны пераслед працягваў быць самым распаўсюджаным відам рэпрэсій грамадзянскай супольнасці. Праваабарончаму цэнтру «Вясна» вядома пра 2 627 асуджаных паводле палітычна матываваных крымінальным спраў з пачатку выбарчай кампаніі 2020 года. Агулам з тых часоў амаль 3,8 тысячы чалавек, згодна са звесткамі «Вясны», сутыкнуліся з крымінальным пераследам паводле палітычных матываў. Гэтыя звесткі з'яўляюцца няпоўнымі, бо развязаны ўладамі тэрор у дачыненні да фігурантаў спраў, праваабаронцаў, журналістаў, валанцёраў робіць немагчымым паўсюдны збор інфармацыі пра крымінальныя справы. Адсутнасць доступу да інфармацыі — гэта вынік высілкаў рэжыму, якія ставяць сабе за мэту зрабіць нябачнымі значную частку рэпрэсій.

У першыя месяцы 2022 года працягваўся распачаты ў 2020–2021 гадах крымінальны пераслед за ўдзел у акцыях пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў

2020 года, супраць гвалту ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў і іншых дзеянняў дэ-факта ўладаў Беларусі. Намеснік старшыні Вярхоўнага суда Валерый Калінковіч заявіў, што паводле пратэсных крымінальных спраў са жніўня 2020 года па люты 2022 года асуджана 1 832 чалавекі, з якіх 168 чалавек былі асуджаны за арганізацыю і падрыхтоўку масавых беспарадкаў або актыўны ўдзел у іх, 396 — за групавыя дзеянні, якія парушаюць грамадскі парадак, 468 — за абразу прадстаўніка ўлады, 126 — за хуліганства, 86 — за знявагу дзяржаўных сімвалаў.

За 2022 год «Вясна» мае звесткі пра 1 242 вынесеныя прысуды паводле палітычна матываваных спраў.

З вясны 2022 года Праваабарончаму цэнтру пачалі паступаць звесткі пра выпадкі падаўжэння тэрміна пазбаўлення волі палітычным зняволеным шляхам выстаўлення абвінавачванняў у злосным непадпарадкаванні патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы (арт. 411 КК). Як правіла, гаворка ішла пра дробныя парушэнні правіл, за якія асуджаныя ўжо панеслі пакаранне ў дысцыплінарным парадку, ці пра адмову выконваць указанні адміністрацыі, якія прывялі б да зніжэння статусу асуджанага згодна з нефармальнымі правіламі узаемаадносінаў асуджаных, якія непублічна культывуюцца адміністрацыяй папраўчых устаноў і выкарыстоўваюцца ёю ў сваіх інтарэсах дзеля ціску на непакорных зняволеных, пасля чаго з'яўляюцца пагрозы жыццю, здароўю і годнасці зняволенага. Вядома пра разгляд спраў паводле дадзенага артыкулу ў дачыненні да не менш як 15 палітычных зняволеных, у тым ліку Руслана Акосткі, Паліны Шарэнды-Панасюк, Вікторыі Кульшы, Андрэя Навіцкага, Паўла Аўчарова і іншых. Гэтыя справы разглядаюцца на выязных пасяджэннях у папраўчых калоніях, часта без апавяшчэння сваякоў асуджаных і без магчымасці для родных ці іншай публікі прысутнічаць, што фактычна прыраўноўвае такія пасяджэнні да закрытых.

Яшчэ адной распаўсюджанай практыкай рэпрэсій стала ўзмацненне жорсткасці рэжыму ўтрымання палітвязняў: у прыватнасці, улетку 2022 года Мікалай Дзядок, Сяргей Ціханоўскі і Эдуард Пальчыс былі пераведзеныя з калоніі ў турму. Распаўсюджанай практыкай з'яўляецца рэгулярнае змяшчэнне палітычных зняволеных у штрафны ізалятар.

Практыкавалася замена абмежавання волі на пазбаўленне волі за «злоснае парушэнне» парадку адбывання абмежавання волі. Такім з'яўляецца здзяйсненне трох дысцыплінарных правінаў любой цяжкасці, і замена абмежавання волі на пазбаўленне волі з'яўляецца адзінай санкцыяй. Таксама на працягу мінулага году ўзмацнялася жорсткасць ўмоваў адбывання абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову: павялічвалася частата праверак, скарачаўся вольны час, павялічвалася колькасць абавязковых да прысутнасці прафілактычных мерапрыемстваў. З гэтага можна зрабіць выснову, што палітычныя зняволеныя сутыкаюцца з практыкай наўмыснага адвольнага пагаршэння ўмоў утрымання.

Акрамя таго, рэгулярна паступаюць паведамленні пра несвоечасовае аказанне медыцынскай дапамогі асуджаным палітвязням.

Закон «Аб амністыі ў сувязі з Днём народнага адзінства» не распаўсюдзіў магчымасці па вызваленні ад пакарання і скарачэнні тэрміну пакарання на асоб, асуджаных паводле «экстрэмісцкіх» артыкулаў КК, а таксама на тых, хто ўключаны ў Пералік асоб, датычных да

экстрэмісцкай дзейнасці, і не палепшыў становішча палітвязняў. Тым часам, праваабаронцы раней адзначалі, што наладжванне рэальнага нацыянальнага дыялогу з удзелам усіх зацікаўленых бакоў мае неад'емнай ўмовай вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, адмену і перагляд іх прысудаў, пры гэтым шырокая палітычная амністыя ў дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных спраў магла б зрабіцца кампрамісным першым крокам да дасягнення заяўленай мэты.

Таксама ў 2022 годзе дэ-факта ўлады Беларусі шырока выкарыстоўвалі практыку пераследу за любога кшталту іншадумства і пратэсныя дзеянні, распачынаючы крымінальныя справы за ўдзел у дзейнасці «экстрэмісцкіх фармаванняў» — незалежных медыя і асацыяцый, прызнаных уладамі такімі ў непублічным несудовым парадку. З кастрычніка 2021 года МУС і КДБ прызналі экстрэмісцкімі фармаваннямі 107 суб'ектаў, 80 з якіх былі занесены ў спіс у 2022 годзе. КДБ за апошнія два гады ўключыў у Пералік арганізацый і фізічных асоб, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці, 268 чалавек у сувязі з выстаўленнем ім абвінавачванняў і асуджэннем ў Беларусі, а таксама чатыры арганізацыі.

У 2022 годзе набылі моц [змены](#) ў крымінальна-працэсуальнае заканадаўства, якія ўводзяць інстытут спецыяльнай вытворчасці па крымінальных справах — парадак правядзення папярэдняга расследавання і судовага разгляду пры адсутнасці абвінавачанага па шэрагу крымінальных спраў. Практычна адразу такія вытворчасці былі распачатыя і працягваюць распачынацца ў дачыненні да [фігурантаў](#) палітычна матываваных крымінальных спраў, вымушаных з прычыны крымінальнага пераследу пакінуць тэрыторыю Беларусі. Да канца 2022 года спецыяльная вытворчасць СК і КДБ вядзецца ў дачыненні да 17 чалавек, двое з іх ужо асуджаны.

Увесь год у СІЗА без суда ўтрымліваліся паводле надуманых абвінавачванняў старшыня ПЦ «Вясна» Алесь Бяляцкі, сябра Рады ПЦ «Вясна», віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH) Валянцін Стэфановіч, юрыст, каардынатар кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Уладзімір Лабковіч. Такім чынам, тэрмін іх утрымання на канец года ў турэмных умовах склаў 17,5 месяца; у верасні следства адмовілася ад абвінавачвання, на падставе якога праваабаронцы правялі 14 месяцаў у СІЗА, і высунула новыя, не звязаныя з ранейшымі, абвінавачванні ў кантрабандзе, а таксама фінансаванні і забеспячэнні групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, у складзе арганізаванай групы. У няволі таксама працягваюць знаходзіцца [Леанід Судаленка](#), які адбывае ў калоніі прызначаныя судом 3 гады пазбаўлення волі, каардынатарка Валанцёрскай службы «Вясны» [Марфа Рабкова](#), асуджаная да 15 гадоў пазбаўлення волі, і валанцёр [Андрэй Чапюк](#), асуджаны да 6 гадоў пазбаўлення волі.

На 31 снежня 2022 года ў зняволенні знаходзяцца 1 446 чалавек, [прызнаныя беларускай праваабарончай супольнасцю палітычнымі вязнямі.](#) Акрамя таго, больш за 580 палітвязняў былі вызвалены ў сувязі са зменай меры стрымання, з прычыны адбывання пакарання, з іншых падстаў. Адзін палітвязень (В. Ашурак) загінуў у папраўчай калоніі. Такім чынам, праваабаронцамі пасля пачатку выбарчай кампаніі 2020 года было прызнана палітвязнямі больш за 2 020 чалавек.

Па стане на канец 2022 года найвялікшая колькасць фігурантаў (падазраваных, абвінавачваных ці асуджаных) налічвалася паводле крымінальных спраў за арганізацыю і падрыхтоўку дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх

(арт. 342 КК): 493 палітычныя зняволеныя і 303 былыя палітычныя зняволеныя, а агулам паводле арт. 342 КК асуджана не менш як 932 удзельнікі пратэстаў. З асуджаных паводле гэтага артыкулу, дадаткова да крымінальнага пакарання, у пазоўнай вытворчасці спаганяецца нібы нанесеная шкода за блакаванне дарог. У заявах праваабарончай супольнасці аб прызнанні палітычных зняволеных па такіх справах заўсёды адзначаецца, што пераважная большасць акцый пратэсту грамадзян насілі мірны характар і не ўяўлялі пагрозы нацыянальнай ці грамадскай бяспецы, а значыць, не было падставаў для пераследу іх удзельнікаў.

Далей па масавасці асуджаных ідуць дыфамацыйныя артыкулы, да якіх адносяцца абраза прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) — 278 палітычных зняволеных і 67 былых палітычных зняволеных, а таксама абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (арт. 368 КК) — 246 палітычных зняволеных і 23 былыя палітычныя зняволеныя. На думку праваабарончай супольнасці, крымінальны пераслед за мірнае выказванне меркаванняў з'яўляецца недапушчальным.

Яшчэ адным распаўсюджаным крымінальным артыкулам, выстаўленым палітычным зняволеным, з'яўляецца распальванне варожасці і варажнечы (арт. 130 Крымінальнага кодэкса). Фігурантамі крымінальных спраў паводле гэтага артыкулу з'яўляюцца 243 палітычныя зняволеныя і 48 былых палітычных зняволеных. Дадзены артыкул выбарча і дыскрымінацыйна ўжываецца судамі дзеля абароны інстытутаў улады, калі прадстаўнікі праваахоўных органаў і сілавых структур вызначаюцца як пацярпелая ўразлівая група.

Згодна з паведамленнем Следчага камітэта, за амаль два гады — з 9 жніўня 2020 года па 1 ліпеня 2022 года — распачалі больш за 11 тысяч крымінальных спраў паводле «злачынстваў экстрэмісцкай скіраванасці». Як паведаміў у жніўні 2022 года М. Бедункевіч, прадстаўнік ГУБАЗіК МУС — падраздзялення, якое зрабілася сімвалам палітычных рэпрэсій, 79% тых, каго расшукваюць за «злачынствы экстрэмісцкай скіраванасці», выехалі за межы Беларусі. Крымінальны пераслед вядзецца па факце здзяйснення дзеянняў, у адсутнасць падазраваных і абвінавачаных, у дачыненні да асобных людзей, а таксама ў межах буйнейшых крымінальных спраў, як, напрыклад, распачатыя ўпраўленнем Следчага камітэта па горадзе Мінску крымінальныя справы ў дачыненні да нявызначанага кола асобаў згодна з ч. 1 арт. 342 КК (групавыя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і ч. 3 арт. 293 КК (навучанне і іншая падрыхтоўка ўдзелу ў масавых беспарадках), датычныя да мірных пратэстаў у жніўні – верасні 2020 года. Сюды ж можна аднесці, напрыклад, крымінальную справу, у межах якой асуджана больш за 120 чалавек (т. зв. «карагодную справу») за ўдзел у мірных пратэстах у Брэсце ці «справу аб узломе камп'ютарнай сістэмы Мінгарвыканкама». Таксама можна вылучыць групы крымінальных спраў, якія тэматычна звязаныя, але працэдурна знаходзяцца ў розных вытворчасцях, як, напрыклад, «справа Вясны» у дачыненні да праваабаронцаў і валанцёраў Праваабарончага цэнтра «Вясна» ці «справа Зельцэра» за каментары пад публікацыяй аб гібелі супрацоўніка праваахоўных органаў.

Дзеля пераследу апанентаў рэжыму адвольна ўжываюцца абвінавачванні ў здзяйсненні здрады дзяржаве, тэрарыстычных актаў, змовы з мэтай захопу ўлады і іншыя надуманыя прыцягнутыя падставы. Так, медыямэнэджара Андрэя Аляксандрава і Ірыну Злобіну прызналі вінаватымі ў здрадзе дзяржаве і асудзілі за супрацоўніцтва з «замежнай

арганізацыяй» BY_Help і ажыццяўленне дзейнасці, «накіраванай на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі» — перадачу ахвярам пераследу паводле палітычных матываў сродкаў на пагашэнне злучаных з гэтым выдаткаў. Канстанціна Ермаловіча, Віталя Мінкевіча і Ігара Казлова абвінавацілі ў тэрарызме за падпал драўлянага брыля на стрэльбішчы вайсковай часткі.

**Абмежаванне свабоды мірных сходаў**

У 2022 годзе ўлады не санкцыянавалі ніводнага масавага мерапрыемства з удзелам палітычнай апазіцыі, працягнулі разганяць спантанныя мірныя сходы і затрымліваць удзельнікаў мірных акцый пратэсту. Палітыку ўлад можна ахарактарызаваць як масавы пераслед усіх нязгодных пасля палітычных падзей лета – восені 2020 года, знішчэнне іншадумства, помсту за мірныя акцыі пратэсту пасля сфальсіфікаваных выбараў, вынаходніцтва новых метадаў ціску і ўдасканаленне старых.

Улады парушылі і працягваюць парушаць гарантаванае права на мірныя сходы і свабоду выказвання меркаванняў. Ахвярамі парушэння права ў 2022 годзе зрабіліся людзі, якія ўзялі непасрэдны ўдзел у антываенных акцыях пратэсту і акцыях пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў усенароднага рэферэндуму па пытанні змены Канстытуцыі напрыканцы лютага 2022 года, а таксама тыя, хто раней браў удзел у акцыях 2020 года. У большасці сваёй, асабліва апошнія, апазнаваліся праз фатаграфіі і відэа з пратэстаў. За рэалізацыю права на мірныя сходы да людзей ужывалі і працягваюць ужываць адміністратыўнае і крымінальнае пакаранні, катаванні і жорсткае, бесчалавечнае абыходжанне, іншыя рэпрэсуючыя практыкі, як, напрыклад, некалькі адміністрацыйных арыштаў запар, т. зв. «каруселі», вызначэнне чалавека як экстрэміста ці тэрарыста з абмежавальнымі наступствамі і г. д. Планамерна адбывалася ўзмацненне розных формаў ціску і рэпрэсій за актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўлад.

Згодна з інфармацыяй праваабарончага цэнтра «Вясна», у 2022 годзе было затрымана не менш за 6 381 чалавека. З іх амаль паўтары тысячы — жанчыны, яшчэ каля пяці тысяч — мужчыны. Таксама вядома, што было затрымана не менш за 15 непаўнагадовых. «Вясна» валодае звесткамі пра прынамсі 3 272 судовыя рашэнні. Беларускія суды прызначылі не менш за 938 штрафаў на агульную суму ў 888 224 рублі (амаль 325 тысяч даляраў). Таксама суддзі прызначылі мінімум 2 274 арышты. Агулам у ізалятарах беларусы адбылі 28 804 сутак (амаль 78 гадоў). Пры гэтым, згодна са звесткамі праваабаронцаў, з розных прычынаў спынілі толькі 47 спраў.

Акрамя таго, супрацоўнікі міліцыі па-ранейшаму ажыццяўлялі «адпрацоўку» гарадоў, розных раёнаў Мінска і прыгарадаў, урываліся ў дамы і кватэры ў пошуках пратэснай сімволікі, затрымлівалі людзей на працы. Улады ўзмацняюць розныя формы ціску і рэпрэсій за актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць іх дзеяннямі.

Найболей яркім прыкладам масавага парушэння ўладамі права на мірныя сходы за 2022 год з'яўляюцца затрыманні людзей у лютым 2022 года. Незаконныя затрыманні людзей ажыццяўляліся «прэвентыўна» да рэферэндуму, падчас рэферэндуму (калі Святлана Ціханоўская заклікала беларусаў прыйсці на выбарчыя ўчасткі і выказаць пратэст вайне і рэферэндуму), а таксама пасля рэферэндуму, у тым ліку на наступны дзень, калі была

анансаваная акцыя ў Мінску і іншых гарадах каля чыгуначных вакзалаў. За месяц было затрымана не менш за 952 чалавекі.

23 сакавіка 2022 года МУС пачало публічна весці спіс асоб, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, які папаўняецца дагэтуль і на канец года складаўся з 2 263 чалавек. Падставай уключэння ў гэты спіс з'яўляецца вынесены прысуд суда, практычна ўсе з іх — паводле палітычных матываў. Значная частка людзей, унесеных у спіс, асуджаны за групавыя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або за ўдзел у «масавых беспарадках»: 862 — паводле арт. 342 КК, 142 — паводле арт. 293 КК.

Значная частка палітвязняў мае адпаведны статус толькі і ў тым ліку з прычыны рэалізацыі імі права на мірныя сходы. Іх абвінавачваюць у сувязі з парушэннем грамадскага парадку, арганізацыяй і ўдзелам у масавых беспарадках, навучаннем ці іншай падрыхтоўкай асоб да ўдзелу ў масавых беспарадках. Праваабаронцы заяўляюць, што ні масавых беспарадкаў, ні дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, у Беларусі не было.

З 1 446 палітвязняў 495 прызнаныя такімі з прычыны пазбаўлення волі паводле абвінавачвання па арт. 342 КК, а таксама па арт. 342-2 «Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавых мерапрыемстваў». 202 палітвязням выстаўлены абвінавачванні паводле розных частак арт. 293 КК «Масавыя беспарадкі».

**Абмежаванне свабоды выказвання меркавання**

У 2022 годзе ўлады працягнулі жорстка абмяжоўваць і спыняць любыя формы выказвання альтэрнатыўнага афіцыйнаму меркавання. Летась гэта датычылася таксама і тэмы развязанай Расійскай Федэрацыяй вайны ва Украіне. На працягу года ўлады працягвалі актыўна ўжываць крымінальны і адміністрацыйны пераслед грамадзян паводле палітычных матываў за выказванне меркавання, а таксама іншыя формы ціску.

Улады падтрымліваюць высокі ўзровень рэпрэсій за актыўную грамадзянскую пазіцыю і асуджэнне афіцыйнай палітыкі. У судах, як правіла ў рэжыме відэаканферэнцыі, праходзяць разгляды адміністрацыйных спраў у дачыненні да грамадзян, якіх затрымлівалі за розныя пратэсныя дзеянні і сімволіку, падпіскі на пратэсныя крыніцы інфармацыі, рэпосты і каментары ў сацыяльных сетках, а таксама за іншыя формы пратэсту ці выказвання меркаванняў, нелаяльнасць і іншадумства.

Вынікі разгляду вялікай колькасці спраў, фігуранты якіх абмяжоўваліся ў свабодзе выказвання меркаванняў з выкарыстаннем крымінальнага заканадаўства, дапоўнілі статыстыку асуджэнняў за абразу службовых асоб, суддзяў, А. Лукашэнкі. Так, ад пачатку пераследу ў 2020 годзе за выказванні, як правіла звязаныя з парушэннем уладнымі суб'ектамі закона і правоў чалавека, паводле арт. 369 КК за абразу службовых асоб было асуджана не менш як 663 чалавекі, паводле абвінавачвання ў абразе А. Лукашэнкі — 346, паклёпе на яго — 51, абразе суддзі — 49 чалавек. Некаторыя з іх асуджаны паводле некалькіх абвінавачванняў, такім чынам агулам асуджаных па такіх справах — не менш за 1000 чалавек, якіх асудзілі да розных пакаранняў, у тым ліку да пазбаўленні волі.

Нярэдка сутнасць правапарушэння складалася толькі ва ўхваленні ці рэпосце чужых выказванняў, а пад неабходную для кваліфікацыі ацэнку формы выказванняў як

непрыстойнай падпадалі цалкам прымальныя з пункту гледжання кантэксту і этыкі публікацыі.

Некалькі чалавек асуджана за выказванні ў дачыненні да дзяржавы і дзеянні ў адносінах да яе сімвалаў: не менш за 16 чалавек — за дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь, не менш за 45 — за заклікі да мер абмежавальнага характару (санкцый), не менш за 110 — за «знявагу» дзяржаўных сімвалаў, звычайна гэта зрыванне і пашкоджанне чырвона-зялёнага сцяга, які намаганнямі ўладаў зрабіўся сімвалам рэпрэсій і жорсткага задушэння пратэсту.

Не менш як 234 чалавекі асуджаны за распальванне іншай сацыяльнай варожасці ці варажнечы згодна з арт. 130 КК: як правіла, гэта былі выказванні рознай ступені катэгарычнасці, якія змяшчаюць негатыўную ацэнку і асуджэнне дзеянняў прадстаўнікоў улады, развагі пра неабходнасць і непазбежнасць прыцягнення да адказнасці за злачынствы супраць чалавечнасці, магчымасці ўжывання гвалту ў адказ ў адносінах да прадстаўнікоў сілавых ведамстваў, якія парушаюць правы грамадзян, і выключна рэдка — пэўныя заклікі да ўжывання неадраснага гвалту ў дачыненні да гэтай катэгорыі асобаў.

У 2022 годзе свабода выказвання меркавання парушалася пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам. Улады актыўна ўключаюць людзей, арганізацыі і інфармацыйную прадукцыю ў кантраляваныя і санкцыйныя спісы, такія як Пералік арганізацый, фармаванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці; Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян ці асоб без грамадзянства, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, і Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Таксама мінулы год быў адметны і пашырэннем практыкі ў гэтым кірунку: цяпер «экстрэмісцкі статус» можа зрабіцца асноўным складнікам пры пазбаўленні людзей грамадзянства ці завочнага судаводства, адмове ва ўжыванні амністыі.

У сярэдзіне снежня парламент ухваліў законапраект аб зменах у Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», які дазволіць апанентаў рэжыму, якія пражываюць за мяжой, не толькі судзіць завочна, але і пазбаўляць грамадзянства. Рабіць гэта можна будзе «ў сувязі з наяўнасцю прысуду, які набыў законную моц і які пацвярджае ўдзел у экстрэмісцкай дзейнасці ці нанясенне цяжкай шкоды інтарэсам Рэспублікі Беларусь». Законапраект прапануе пазбаўляць грамадзянства беларусаў па нараджэнні, асуджаных паводле аднаго з пералічаных 55 артыкулаў Крымінальнага кодэкса, сярод якіх — распальванне варожасці і варажнечы, найміцтва, акт тэрарызму, удзел у масавых беспарадках, стварэнне экстрэмісцкага фармавання ці ўдзел у ім і іншыя.

Згодна з Законам «Аб процідзеянні экстрэмізму», людзям, уключаным у Пералік асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, вызначаюцца на працягу пяці гадоў пасля пагашэння ці здымання судзімасці шэраг забаронаў і абмежаванняў: ім забараняецца займацца дзейнасцю, злучанай з абаротам наркатычных і псіхатропных рэчываў, зброі і боепрыпасаў, выбуховых рэчываў, педагагічнай і выдавецкай дзейнасцю, а таксама займаць дзяржаўныя пасады, праходзіць вайсковую службу. Таксама фінансавыя аперацыі такіх людзей падлягаюць адмысловаму кантролю. Для замежнікаў уключэнне ў спіс можа зрабіцца падставай для адмовы ў выдачы візы ці ва ўездзе ў Рэспубліку Беларусь.

Артыкул 19.11 КаАП, паводле якога караецца распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў, увесь час выкарыстоўваецца беларускімі ўладамі дзеля рэпрэсій у дачыненні да іншадумцаў. Як

правіла, караецца рэпост розных матэрыялаў грамадска-палітычнага характару з рэсурсаў, чыя інфармацыйная прадукцыя прызнаная экстрэмісцкай. Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў налічвае каля 2 750 пазіцый, больш за 1 220 з якіх уключаныя ў спіс у 2022 годзе.

СМІ пазбаўляюцца рэгістрацыі і акрэдытацыі, а іх журналісты зазнаюць крымінальны пераслед за выкананне сваіх прафесійных абавязкаў. Церпяць ад крымінальнага пераследу кіраўнікі незалежных СМІ. Згодна са звесткамі Беларускай асацыяцыі журналістаў, 33 супрацоўнікі СМІ знаходзіліся ў зняволенні на канец года, на працягу года 43 журналісты зазналі затрыманні.

Важнай заканадаўчай зменай было ўвядзенне новага артыкула Крымінальнага кодэкса — 130-2 КК «Адмаўленне генацыду беларускага народа»: гэты артыкул з'явіўся ў Законе ад 5 студзеня 2022 г. № 146-З «Аб генацыдзе беларускага народа». Фактычна дадзены закон накладвае манаполію на трактоўку гістарычных падзей 1941–1951 гадоў з санкцыяй да 10 гадоў пазбаўлення волі, што парушае стандарты права на свабоду выказвання меркавання.

**Парушэнне свабоды асацыяцый**

Парушэнне права на асацыяцыю адбывалася ў выглядзе працягу ліквідацыі і прымусу да ліквідацыі з уласнай ініцыятывы недзяржаўных некамерцыйных арганізацый, а разам з гэтым — у форме жорсткага крымінальнага пераследу ўдзельнікаў розных нефармальных груп, аб'яднаных у тым ліку з дапамогай сацыяльных сетак і Telegram, па шэрагу крымінальных складаў.

Згодна са звесткамі Праваабарончай арганізацыі Lawtrend, з 2021 года ліквідавана і знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі каля 1 180 недзяржаўных арганізацый: 759 прымусова, 419 з ініцыятывы заснавальнікаў. Гэта сведчыць пра працяг тэндэнцыі па знішчэнні інстытутаў грамадзянскай супольнасці. Падставы ліквідацыі, якія выкарыстоўваюць дзяржаўныя органы і суды, не адпавядаюць агульнапрызнаным стандартам у галіне свабоды асацыяцый.

У беларускі парламент унесены шэраг законапраектаў, якія закладаюць аснову для манапалізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці ў руках праўладных грамадскіх аб'яднанняў і партый.

У Крымінальны кодэкс з пачатку 2022 года вярнулі артыкул 193-1, які прадугледжвае адказнасць за ўдзел у дзейнасці незарэгістраванага ці ліквідаванага грамадскага аб'яднання, фонду, рэлігійнай суполкі ці палітычнай партыі.

За стварэнне экстрэмісцкага фармавання, кіраўніцтва ім, а таксама за ўваходжанне ў яго ў мэтах здзяйснення злачынстваў экстрэмісцкага характару, падаванне ці збор сродкаў для іх, іншае садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці да канца года было асуджана не менш як 83 чалавекі. Як ужо адзначалася, прызнанне суб'ектаў экстрэмісцкімі фармаваннямі адбываецца адвольна, непублічна, у адміністрацыйным парадку; пад фінансаваннем, за якое надыходзіць крымінальная адказнасць, разумеюць у тым ліку невялікія легальныя ахвяраванні, а як садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці можа быць расцэнена нават інтэрв'ю СМІ, раней адвольна прызнанаму экстрэмісцкім фармаваннем, перасыланне

такому рэсурсу звестак пра перасоўванне расійскіх войскаў, пускі ракет у бок Украіны і іншай інфармацыі, што мае антываенны характар.

Летась былі адвольна ліквідаваны незалежныя прафсаюзы, іх лідары былі асуджаны на працяглыя тэрміны зняволення.

**Катаванні і іншыя жорсткія, бесчалавечныя ці зневажальныя годнасць віды абыходжання і пакарання**

У 2022 годзе «Вясна» зафіксавала 227 выпадкаў катаванняў і жорсткага абыходжання ў дачыненні да 89 жанчын і 138 мужчын. 91 чалавек стаў ахвярай такога абыходжання ў 2022 годзе.

Катаванні і жорсткае абыходжанне ўжываліся: да непаўнагадовых — 2 чалавекі; ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў — 87 чалавек; ад 31 да 40 гадоў — 74 чалавекі; ад 41 да 50 гадоў — 30 чалавек; больш за 50 гадоў — 31 чалавек.

Аналіз атрыманых звестак дазваляе сцвярджаць, што катаванні і забароненае абыходжанне па-ранейшаму маюць масавы, сістэмны характар і з'яўляюцца арганізаванай, палітычна матываванай карнай акцыяй улад дзеля запалохвання беларускага грамадства.

Самым гучным выпадкам ужывання сілавікамі зброі з відавочнымі прыкметамі адступлення ад меркаванняў прапарцыйнасці ў 2022 годзе з'яўляецца затрыманне «рэйкавых партызанаў» — людзей, якія з антываенных меркаванняў выводзілі з ладу аб'екты чыгуначнай інфраструктуры, перашкаджаючы перакідванню расійскіх войскаў і вайсковых грузаў. У ноч на 30 сакавіка 2022 года пры сілавой падтрымцы САХРа былі затрыманыя трое «рэйкавых партызанаў» з Бабруйска. Міністэрства ўнутраных спраў паведаміла, што «падчас затрымання мужчыны аказалі актыўнае супраціўленне і паспрабавалі ўцячы». Сілавікі ўжылі зброю на паражэнне. Адзін з затрыманых, Віталь Мельнік, быў паранены і змешчаны ў лячэбную ўстанову, іншым аказалі медыцынскую дапамогу на месцы. 22 снежня 2022 года Мельніка асудзілі да 13 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмове асаблівага рэжыму. Віталь дагэтуль у СІЗА перасоўваецца на мыліцах.

1 лютага 2022 года Мікіта Старажэнка — былы следчы, які звольніўся пасля выбараў на знак пратэсту — падчас затрымання зазнаў катаванні. Сукамернік распавёў, што Мікіту білі нагамі, дубінкамі, намотвалі анучу на галаву. На «пакаяльным» відэа ён выглядаў напалоханым, а на твары былі заўважныя пашкоджанні.

Умовы ўтрымання адміністрацыйна арыштаваных наўмысна пагаршаюцца да катавальных: адсутнасць індывідуальнага спальнага месца, пасцельнай бялізны, прагулак і перадач, перапоўненыя камеры і пад'ёмы ў начны час. Так людзі адбывалі адміністратыўны арышт у розных гарадах Беларусі ў 2022 годзе. Асобы, якія адбывалі адміністрацыйны арышт паводле палітычна матываванага пераследу, утрымліваліся ў жорсткіх, бесчалавечных і зневажальных годнасць умовах. Умовы ўтрымання арыштаваных не адпавядалі нацыянальнаму заканадаўству, а таксама Мінімальным стандартным правілам абыходжання са зняволенымі. Згодна з расказамі адміністрацыйна арыштаваных, матрацы, пасцельную бялізну, падушкі і ручнікі не выдавалі. Спаць даводзілася на падлозе, або на лаўцы, або на металічных кратах ложка. Камеры перапоўнены. Святло ўначы не выключалі. Не менш за два разы за ноч праводзілася праверка: чалавек павінен устаць і назваць сваё

прозвішча. Прагулкі адсутнічалі, у душ не выводзілі, мыцца даводзілася непасрэдна ў камеры, пітную ваду не выдавалі. Перадачы аддавалі толькі ў дзень вызвалення.

Пры гэтым беларускія ўлады цынічна не задаволілі ніводнай скаргі на ўмовы ўтрымання. Амаль усе адказы, пра якія вядома «Вясне», былі ідэнтычнымі: «У выніку праведзенай праверкі ў дзеяннях супрацоўнікаў [...] парушэнняў дзейснага заканадаўства не выяўлена».

«Вясна» мае звесткі пра мінімум 2 274 вынесеныя рашэнні аб прызначэнні пакарання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту. Агулам у ізалятарах у катавальных умовах беларусы адбылі 28 804 сутак (амаль 78 гадоў).

«Вясна» працягвала сваю дзейнасць у якасці сузаснавальніцы Міжнароднай платформы падсправаздачнасці Беларусі (IAPB) — яна ўяўляе сабою кааліцыю незалежных няўрадавых арганізацый, якія аб'ядналі свае высілкі дзеля збору, кансалідацыі, праверкі і захавання доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, што з'яўляюцца злачынствамі згодна з міжнародным правам і былі здзейсненыя беларускімі ўладамі ў 2020-м і наступных гадах.

**Права на жыццё. Смяротнае пакаранне**

У 2022 стала вядома пра прывядзенне ў выкананне смяротнага прысуду ў дачыненні да Віктара Паўлава. Камітэт ААН па правах чалавека асудзіў Рэспубліку Беларусь за прывядзенне ў выкананне смяротнага прысуду ў дачыненні да В. Паўлава, чыя справа ўсё яшчэ знаходзіцца на разглядзе Камітэта. КПЧ адзначыў: з 2010 года Віктар Паўлаў з'яўляецца ўжо 15-м па ліку чалавекам, пакараным Рэспублікай Беларусь падчас разгляду яго справы Камітэтам ААН па правах чалавека, нягледзячы на неаднаразовыя просьбы Камітэта прыпыніць выкананне прысуду на час разгляду яго скаргі аб заяўленых парушэннях яго правоў.

На працягу года ўлады паслядоўна, насуперак прынятым на сябе дзяржавай міжнародным абавязальніцтвам, рабілі крокі для заканадаўчага пашырэння сферы ўжывання смяротнага пакарання: 29 траўня набылі моц папраўкі, паводле якіх смяротнае пакаранне можа ўжывацца не толькі за скончаныя злачынствы, якія пацягнулі смерць чалавека, але і замах на здзяйсненне злачынстваў, прадугледжаных ч. 2 арт. 124, ч. 3 арт. 126, ч. 3 арт. 289 і ч. 2 арт. 359 Крымінальнага кодэкса. У сфармаванай практыцы адвольнай кваліфікацыі пратэсных дзеянняў як тэрарыстычнага акту гэта можа прывесці да ўжывання смяротнага пакарання без уліку рэальнай грамадскай небяспекі здзейсненага.

У снежні стала вядома, што на разглядзе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу знаходзіцца законапраект, які прадугледжвае магчымасць «ужывання выключнай меры пакарання ў выглядзе смяротнага пакарання за здраду дзяржаве, здзейсненую службовай асобай, якая займае дзяржаўную пасаду, ці асобай, на якую распаўсюджваецца статус вайскоўца».

**Несправядлівы суд. Незаконнае затрыманне жанчын**

Суды канчаткова аформіліся ў эфектыўны інструмент рэпрэсій у дачыненні да фігурантаў палітычна матываваных адміністрацыйных, крымінальных і грамадзянскіх спраў.

Паводле адміністрацыйных спраў суддзі па-ранейшаму, як правіла ў рэжыме відэаканферэнцыі, асуджаюць людзей без належнай крытычнай ацэнкі прадстаўленых

міліцыяй матэрыялаў, у тым ліку неаднаразова паслядоўна, на падставе відавочна сумнеўных абвінавачванняў.

Нягледзячы на вызначаную нацыянальным заканадаўствам забарону затрымліваць жанчын, якія маюць на ўтрыманні непаўнагадовых дзяцей, на тэрмін звыш за тры гадзіны, незаконнае адміністрацыйнае затрыманне актыўна ўжывалася ў 2022 годзе. Жанчын затрымлівалі паводле палітычна матываваных адміністрацыйных спраў і змяшчалі ў месцы ўтрымання да суда. Супрацоўнікі міліцыі, начальнікі месцаў утрымання затрыманых і суддзі ў розных гарадах Беларусі, ведаючы, што затрыманне з'яўляецца незаконным, не аднаўлялі права жанчын на свабоду і асабістую недатыкальнасць і неадкладна не вызвалялі іх.

У прыватнасці, у сакавіку 2022 года ў ізалятары часавага ўтрымання горада Магілёва (далей — ІЧУ) судовае пасяджэнне праходзіла дыстанцыйна, шляхам выкарыстання відэаканферэнцсувязі. На судовым пасяджэнні жанчына (імя не раскрываецца) падкрэсліла, што яе нельга затрымліваць даўжэй за тры гадзіны, аднак суддзя суда Кастрычніцкага раёна горада Магілёва ніяк не адрэагавала на гэтае грубае парушэнне закона супрацоўнікамі міліцыі і службовымі асобамі месцаў утрымання. Але ў пастанове па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні зафіксаваная наяўнасць у асобы, прыцягнутай да адміністрацыйнай адказнасці, непаўнагадовых дзяцей. Тэрмін затрымання жанчыны склаў каля 24 гадзін. 13 ліпеня 2022 года затрымалі Марыну Кіявец, на ўтрыманні якой былі непаўнагадовыя дзеці. З 13 ліпеня 2022 года па 18 ліпеня 2022 года жанчына знаходзілася ў ІЧУ Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. За гэты час яе тройчы прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці паводле артыкула 19.11 КаАП. Суддзя Мікалай Стасевіч, высветліўшы акалічнасці працяглага затрымання, не аднавіў парушаныя правы ўдзельніцы працэсу. На некалькі сутак была затрымана за антываенную акцыю Ганна Тукава, якая мае непаўнагадовае дзіця.

Па крымінальных справах у палітычна матываваныя працэсы ўцягнута больш як 400 суддзяў — амаль траціна суддзяў судоў агульнай юрысдыкцыі.

Суддзі па-ранейшаму ігнаруюць прэзумпцыю невінаватасці, праводзячы судовыя пасяджэнні, у якіх абвінавачаныя ўтрымліваюцца ў клетках, у кайданках усярэдзіне клеткі, не рэагуюць на паведамленні наконт ужывання да абвінавачаных катаванняў, парушаючы права на абарону. Рэгулярна без належных падстаў праводзяцца закрытыя і фактычна закрытыя судовыя пасяджэнні (з адвольным абмежаваннем магчымасці прысутнасці гледачоў, на тэрыторыі закрытых устаноў, без абвяшчэння пра месца і час судовага пасяджэння). Гэта істотна ўплывае на працэсуальныя правы абвінавачаных і дазваляе ўтойваць недагляды, самавольства і злачынствы, якія здзяйсняюцца ў дачыненні да абвінавачаных пры затрыманні, падчас расследавання справы і падчас суду.

Нярэдка абвінавачаныя не могуць у поўнай ступені рэалізаваць права на абарону, найперш праз тое, што адвакаты не маюць магчымасці выконваць свае абавязкі ў абстаноўцы, свабоднай ад ціску, запалохвання, страху за ўласную будучыню

Адвакатура ў асобе сваіх органаў самакіравання саступіла ціску дзяржаўнай улады і зрабілася разам з Міністэрствам юстыцыі інструментам пераследу адвакатаў за прафесійнае і сумленнае выкананне сваіх абавязкаў.

«Кардынальнае пагаршэнне ўмоў ажыццяўлення адвакацкай дзейнасці, уключаючы змены заканадаўства аб адвакатуры, якія выключылі такія формы арганізацыі працы адвакатаў, як бюро і індывідуальная практыка, штодзённая праца адвакатаў у атмасферы адсутнасці незалежнасці і страху перад магчымымі санкцыямі, латэнтны ціск, перашкоды эфектыўнаму выкананню адвакатамі сваіх абавязкаў, а таксама пазбаўленне больш як 60 адвакатаў права на прафесію і дыскрымінацыйныя ўмовы прыёму ў адвакатуру прывялі да скарачэння ў 2020–2022 гадах адвакацкага корпусу не менш як на 12 %. Колькасць адвакатаў у Беларусі ў ліпені 2022 года склала 1 780, то бок прыкладна 1 адвакат на 5 тысяч насельніцтва, што відавочна несумяшчальна з прынцыпам даступнасці юрыдычнай дапамогі», — адзначалася ў дакладзе «Крызіс беларускай адвакатуры: як вярнуць права на абарону».

6 адвакатаў пазбаўленыя свабоды паводле палітычных матываў.